# НЯКЛЯЕЎ Уладзімір Пракопавіч



Нарадзіўся 11 ліпеня 1946 г. у Смаргоні. Закончыў Мінскі электратэхнікум сувязі, Мінскі педагагічны інстытут, Маскоўскі літаратурны інстытут.

Паэт, журналіст, пісьменнік, грамадскі дзеяч. Аўтар шматлікіх кніг, паэтычных складанак, папулярных беларускіх песень. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь імя Я.Купалы. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

Працаваў сувязістам на Поўначы, у Сібіры, на Далёкім Усходзе. У канцы 60-х вярнуўся ў Мінск і заняўся журналістыкай і літаратурнай працай. Стварыў і доўгія гады быў галоўным рэдактарам папулярнага часопіса «Крыніца» («Родник»), газеты «Літаратура і мастацтва». Працаваў у рэдакцыі газеты «Знамя юности», на Беларускім тэлебачанні.

Зараз з'яўляецца выканаўчым дырэктарам Міжнароднага грамадскага аб'яднання сацыяльнай падтрымкі дзяцей і моладзі «Клопат».

З 1998 па 2001 г. — старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў. З 2005 г. У.П.Някляеў — прэзідэнт Беларускага ПЭН-цэнтра (міжнароднай пісьменніцкай арганізацыі). З 2010 г. — дырэктар Даследча-асветніцкай установы «Рух наперад», лідар грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду».

Жанаты, мае дзвюх дачок.